Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

14 сакавіка 2014 года, № 4 (2107)

ПАДЗЕЯ

# Прызнанне ў В'етнаме

**Званне «Ганаровы прафесар Універсітэта Бінь Зыонг» (В'етнам)** прысвоена рэктару БДУ акадэміку Сяргею АБЛАМЕЙКУ.




*Рэктар в'етнамскага ўніверсітэта Каа Ван Фыонг уручае Сяргею Абламейку дыплом ганаровага прафесара*

Адпаведны дыплом і мантыю ўручыў яму 5 сакавіка рэктар в'етнамскай ВНУ Каа Ван Фыонг на пашыраным рэктараце Універсітэта Бінь Зыонг. Ганаровага звання Сяргей Абламейка ўдастоены за развіццё навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж нашай краінай і Сацыялістычнай Рэспублікай В'етнам.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання адбылася ў рамках афіцыйнага візіту ва Універсітэт Бінь Зыонг дэлегацыі БДУ ў складзе рэктара акадэміка Сяргея Абламейкі, дэкана факультэта даўніверсітэцкай адукацыі Вячаслава Малафеева і загадчыка кафедры інфармацыйных тэхналогій кіравання ФПМІ Віктара Краснапрошына.

Наведванне В'етнама прайшло з 1 па 8 сакавіка паводле працоўнага плана *Беларуска-в'етнамскага інавацыйна-адукацыйнага цэнтра.* Мэтай візіту стала абмеркаванне вынікаў дзейнасці гэтай структуры ў 2013 г. і ўзгадненне плана працы на 2014 г. Акрамя таго, беларускія навукоўцы правялі навуковыя семінары для выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і магістрантаў універсітэцкай правінцыі Бінь Зыонг. Так, на семінары «Інфармацыйныя сістэмы ў медыцыне: вопыт распрацоўкі і ўкаранення ў медыцынскіх установах В'етнама і Беларусі» з дакладам «Электронная ахова здароўя: інфармацыйныя сістэмы ў шпіталях і тэлемедыцынскія сістэмы» выступіў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка. Прафесар Віктар Краснапрошын распавёў пра «Распрацоўку медыцынскіх інфармацыйных сістэм на аснове біятэлеметрыі».

На семінары «Навучанне рускай мове в'етнамскіх слухачоў і студэнтаў: традыцыі і вопыт, стан і перспектывы развіцця» Вячаслаў Малафееў выступіў з дакладам «Традыцыі і навацыі ў выкладанні рускай мовы на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі БДУ».

**ДАВЕДКА**

Беларуска-в'етнамскі інавацыйна-адукацыйны цэнтр створаны ў 2012 годзе. Функцыянаванне цэнтра спрыяе ўсталяванню даступнага і спрошчанага парадку абмену навуковымі і інавацыйнымі дасягненнямі абедзвюх краін і ўмацоўвае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва.

На базе цэнтра рэалізуюцца сумесныя праекты ў галіне медыцынскай інфарматыкі, біятэхналогій і нанатэхналогій, сучасных тэхналогій навучання рускай мове замежных грамадзян.

**Ірына МІРОНАВА**

## Чытайце ў нумары:

**ЗАЛАТЫЯ ЛІТАРЫ АРХЕАЛОГІІ**

Да 85-годдзя выбітнага беларускага археолага і гісторыка, прафесара Эдуарда ЗАГАРУЛЬСКАГА

Стар. 2

**УНІКАЛЬНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ НАШЫХ БІЯФІЗІКАЎ**

Ствалавыя клеткі сёння ва ўсіх на слыху. Што ж насамрэч уяўляюць сабой гэтыя цудаклеткі?

Стар. 3

**РУХАВІК РОСТУ ЭКАНАМФАКА**

Залаты і два сярэбраныя медалі заваявалі студэнты эканамічнага факультэта БДУ на міжнародным чэмпіянаце па карпаратыўных фінансах Growth Driver

Стар. 4

## Весткі з рэктарата

У БДУ 4 сакавіка прайшоў **міжнародны семінар «Досвед еўрафакультэтаў для будучыні»**, які сабраў вядучых экспертаў праекта «Еўрафакультэт». Ён фінансуецца Універсітэцкай сеткай рэгіёна Балтыйскага мора (BSRUN) пры падтрымцы Савета дзяржаў Балтыйскага мора і мае на мэце стварэнне сеткі ўніверсітэтаў-партнёраў і распрацоўку сучасных навучальных праграм, адпаведных еўрапейскім стандартам у галіне эканомікі, палітычнай навукі і права.

Галоўнай тэмай стала абмеркаванне перспектыў адкрыцця падобнага еўрафакультэта на базе БДУ. У семінары бралі ўдзел прэзідэнт BSRUN Кары Хіпанен і старшы дарадца Сакратарыята дзяржаў Балтыйскага мора Ірыс Кемпе. Нагадаем, БДУ з'яўляецца членам BSRUN з кастрычніка 2013 г.

* * *

РЭКТАР Універсітэта г. Турку (Фінляндыя) *Калерва Вяянянен* 6 сакавіка наведаў БДУ. У сустрэчы прынялі ўдзел: першы прарэктар Міхаіл Журавкоў, прарэктар па навуковай рабоце Алег Івашкевіч, прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях Уладзімір Панарадаў, намеснік дэкана хімічнага факультэта Таццяна Савіцкая, намеснік дэкана біялагічнага факультэта Анатоль Саколік, загадчык лабараторыі біяхіміі абмену рэчываў Міхаіл Шолух, загадчык кафедры клеткавай біялогіі і біяінжынерыі раслін Вадзім Дзямідчык і дырэктар РУП «Унітэхпрам БДУ» Павел Бычкоўскі.

Госця пазнаёмілі з дзейнасцю БДУ, а таксама распавялі пра найбольш выбітныя распрацоўкі ВНУ ў сферы біялогіі і хіміі. Акрамя таго, былі абмеркаваныя перспектывы супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ДЗЕНЬ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

ФЕСТЫВАЛЬ ФАКУЛЬТЭТАЎ БДУ

БДУ – АБІТУРЫЕНТАМ!!!



месца правядзення:
ЛІЦЭЙ БДУ
вул. Ульянаўская, 8

29 САКАВІКА
10:00-16:00

Толькі тут вы атрымаеце самую поўную інфармацыю пра ўступную кампанію і новыя спецыяльнасці

АСОБЫ

# Залатыя літары археалогіі

У канцы 2013 г. на гістарычным факультэце БДУ адбыліся дзве знамянальныя падзеі – 85-годдзе выбітнага беларускага археолага і гісторыка, прафесара, доктара гістарычных навук **Эдуарда ЗАГАРУЛЬСКАГА** і 40-годдзе створанай ім кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін (з 2001 г. кафедра археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін).



*Эдуард Загарульскі з дэканам Сяргеем Ходзіным*

З 1962 г. на працягу паўстагоддзя навуковая і педагагічная дзейнасць Эдуарда Міхайлавіча звязаная з універсітэтам, дзе ён прайшоў шлях ад шарагова выкладчыка да прафесара (1986) і дэкана гістарычнага факультэта (1986–1991). Ён стварыў і ўзначаліў першую ў нашай краіне кафедру археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, якой кіраваў амаль 25 гадоў. Сярод выпускнікоў кафедры 4 дактары, звыш 20 кандыдатаў навук. Талент Эдуарда Міхайлавіча як навукоўца, педагога, арганізатара гістарычнай навукі найбольш ярка адкрыўся ва ўніверсітэце. Яго лекцыі, глыбока змястоўныя з навуковага пункта погляду, дасканалыя па майстэрстве выкладання, выклікаюць непадробную цікавасць шматлікіх пакаленняў студэнтаў. Сучасны наватарскі падыход да працэсу навучання выявіўся і ў тым, што задоўга да ўвядзення модульна-рэйтынгавай сістэмы ён фактычна ўжо па ёй працаваў, укараняючы ў практыку тэсціраванне студэнтаў на самых першых машынах КІСІ-5, затым на камп'ютарах, распрацаваўшы адмысловыя праграмы.

Э. М. Загарульскі з'яўляецца аўтарам **першага ў краіне падручніка «Археалогія Беларусі»** (1965), па яго ініцыятыве створаны навучальны дапаможнік «Гістарычнае краязнаўства Беларусі» (1980), які не мае аналагаў і дагэтуль. У 1998 г. выйшаў навучальны дапаможнік для вышэйшай школы «Заходняя Русь IX–XIII стст.». Ім таксама былі напісаныя падручнікі для сярэдняй школы. Для шырокага кола чытачоў выдадзеная «Гісторыя Беларусі ў кароткім выкладзе» (2002). Ён апублікаваў 14 манаграфій і звыш 100 артыкулаў у айчынных і замежных выданнях. Упершыню ў краіне пасля 1917 г. ён распрацаваў і чытаў у Жыровіцкай духоўнай акадэміі курс «Царкоўная археалогія».

Найярчэйшай старонкай у археалагічнай біяграфіі Эдуарда Міхайлавіча, свайго роду «падарункам лёсу», былі **раскопкі Вішчынскага раннефеадальнага замка XII–XIII стст.** пад Рагачовам, якія амаль на працягу 10 гадоў (1976–1985) вяліся пад яго кіраўніцтвам. Вішчынскі замак, які з'яўляецца эталонным помнікам у серыі раннефеадальных сядзіб, падарыў не толькі найбагацейшую калекцыю прадметаў матэрыяльнай культуры, што папоўніла экспазіцыю навучальнага музея гістарычнага факультэта, але і ўнікальны па складзе і гістарычнай значнасці скарб высокамастацкіх сярэбраных упрыгожванняў і плацежных зліткаў (1979). Для беларускай археалогіі гэта было сенсацыйным адкрыццём, такое бывае ў жыцці не кожнага археолага. Вынікі вывучэння помніка абагульненыя ў манаграфіі «Вішчынскі замак XII–XIII стст.» (2004), якую ён прысвяціў студэнтам гістфака. Славянская праблематыка знайшла сваё адлюстраванне ў манаграфіях «Старажытная гісторыя Беларусі: нарысы этнічнай гісторыі і матэрыяльнай культуры (да IX ст.)» (1977), «Славяне. Паходжанне і рассяленне на тэрыторыі Беларусі» (2012).

Прыемна, што напярэдадні юбілею ўбачыла святло яго новая, пышна выдадзеная і праілюстраваная аўтарам **манаграфія «Белая Русь з сярэдзіны I тысячагоддзя да сярэдзіны XIII стагоддзя» (2013)**, якая справядліва можа лічыцца вяршыняй творчай думкі навукоўца. У маштабе ахопу матэрыялу, навізне падыходу, глыбіні тэарэтычных рашэнняў яна не мае сабе роўных сярод айчынных выданняў. Пад новым вуглом разгледжаныя найскладанейшыя праблемы этнагенезу славян, этапы і храналогія іх рассялення на тэрыторыі Усходняй Еўропы, узнікненне дзяржаўнасці.

Доўгія гады Э. М. Загарульскі быў членам прэзідыума Беларускага фонду культуры, ён з'яўляецца членам спецыялізаванага савета па абароне доктарскіх дысертацый у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. За заслугі ў навукова-педагагічнай дзейнасці ўзнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР «За выдатныя поспехі ў працы», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу РБ. У 1996 г. яму прысвоена званне «Заслужаны работнік адукацыі РБ», у 2011 – «Заслужаны супрацоўнік БДУ».

У адрас юбіляра паступілі віншаванні ад дырэктара Інстытута археалогіі РАН акадэміка М. А. Макарава, калегаў-археолагаў з Санкт-Пецярбурга, выкладчыкаў Гомельскага, Віцебскага, Полацкага, Магілёўскага дзяржаўных універсітэтаў, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Таварыства беларускай мовы. Асабіста яго павіншаваў віцэ-прэм'ер урада Беларусі А. А. Тозік.

Усё жыццё Эдуарда Міхайлавіча Загарульскага – прыклад гераічнага служэння навуцы і ўніверсітэту. Яго імя ўжо ўпісана залатымі літарамі ў гісторыю беларускай археалогіі, якую ён вывеў на сусветны ўзровень. Гістарычны факультэт ганарыцца тым, што ён вучыў нас і працуе з намі.

Жадаем дарагому юбіляру здароўя, лёгкага пяра і ажыццяўлення невычэрпных творчых планаў!

**Супрацоўнікі гістарычнага факультэта**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Гісторыкі кааперуюцца з МДУ

Падчас візіту кіраўніцтва гістарычнага факультэта БДУ 24 студзеня на гістарычны факультэт МДУ імя М. В. Ламаносава падпісана праграма супрацоўніцтва і адбыўся круглы стол **«Расійска-беларускае ўніверсітэцкае супрацоўніцтва: стан і перспектывы».**

Галоўным вынікам стала падпісанне працоўнай праграмы супрацоўніцтва гістарычных факультэтаў БДУ і МДУ на 2014–2015 гг. (у межах дамовы паміж МДУ і БДУ). Яна змяшчае план сумесных вучэбна-навуковых мерапрыемстваў, у тым ліку абмен дактарантамі і аспірантамі, падрыхтоўку магістарскіх праграм і вучэбных практык, ажыццяўленне даследчыцкіх праектаў і інш.

На сустрэчы дэкан гістарычнага факультэта МДУ акадэмік *Сяргей Карпаў* і дэкан гістарычнага факультэта БДУ *Сяргей Ходзін* падкрэслілі значнасць глыбокіх агульных гістарычных каранёў добрасуседскіх адносін Беларусі і Расіі, сумеснага вывучэння гісторыі Расіі і Беларусі, а таксама вылучылі супрацоўніцтва менавіта нашых універсітэтаў і факультэтаў.

Па словах С. П. Карпава, «універсітэцкая супольнасць грае неад'емную ролю ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы. Галоўнай задачай шматгадовага супрацоўніцтва з беларускімі калегамі было і застаецца разуменне неабходнасці захоўваць непарыўнасць гуманітарных навуковых школ. Але, акрамя паспяховага ўзаемадзеяння ў мінулым, у гістарычных факультэтаў вядучых універсітэтаў Расіі і Беларусі ёсць цудоўная будучыня. Цяперашняя працоўная праграма дазволіць нам сумесна рэалізоўваць буйныя ўніверсітэцкія праекты, а менавіта: правядзенне міжнародных канферэнцый, абмен даследчыкамі, агульную магістарскую практыку, архіўныя пошукі, што, безумоўна, важна і цікава ўсім кафедрам нашага факультэта».

С. М. Ходзін падкрэсліў: «Гісторыя супрацоўніцтва МДУ і БДУ па сутнасці пачынаецца з пралогу: менавіта «Маскоўская камісія», якая займалася пытаннямі падрыхтоўкі да адкрыцця Беларускага ўніверсітэта ў Мінску, уключала ў 1921 г. значную колькасць прафесараў Маскоўскага ўніверсітэта на чале з рэктарам Вячаславам Волгіным. Прафесар МДУ Уладзімір Пічэта стаў першым рэктарам БДУ, а маскоўскі прафесар Дзмітрый Канчалоўскі прачытаў першую лекцыю для беларускіх студэнтаў». Студэнты і аспіранты пачулі пра падтрымку, якую аказалі супрацоўнікі і кіраўніцтва МДУ дзейнасці БДУ ў гады Другой сусветнай вайны, пра ўдзел маскоўскіх калегаў у пасляваенным аднаўленні навуковай школы ў Мінску.

У сустрэчы бралі ўдзел пастаянныя партнёры гістарычнага факультэта МДУ: старшыня савета РГА НКА «Беларусы Масквы», доктар псіхалагічных навук, прафесар Сяргей Кандыбовіч і старшыня Асамблеі народаў Расіі доктар палітычных навук Святлана Смірнова.

Словы падзякі пасольству Беларусі ў РФ за падтрымку ўсіх гуманітарных праектаў, якія маюць дачыненне да гісторыі Беларусі, выказала кіраўнік навукова-даследчага цэнтра гісторыі дыяспар гістфака МДУ Аксана Солапава.

**Андрэй ЛЮБЫ,**
**дацэнт гістарычнага факультэта БДУ**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# Турнір для аматараў ... спрачацца

1–2 сакавіка ў БДУ прайшоў **II міжнародны адкрыты студэнцкі турнір па парламенцкіх дэбатах «МОСТ БДУ–2014».** 24 каманды дэбатараў з ВНУ Беларусі, Расіі і Украіны абмяркоўвалі, каму ў XXI стагоддзі патрэбныя правы чалавека.



Дэбаты – гульня адначасова вельмі простая і вельмі складаная. У кожным раўндзе ўдзельнічаюць чатыры каманды: дзве на баку ўрада і дзве на баку апазіцыі. За 15 хвілін да раўнда аб'яўляецца рэзалюцыя, напрыклад: «Гэтая палата лічыць, што касмапалітызм лепшы, чым любая нацыянальная ідэя». Каманды ўрада і апаненты павінны вылучыць аргументы за ці супраць рэзалюцыі адпаведна. Пры гэтым аргументы павінны быць выразнымі і зразумелым, прамовы структураваным, дэбатары павінны прыводзіць актуальныя прыклады і аналогіі з сусветнага вопыту. У канцы раўнда дасведчаны дэбатар – суддзя – выносіць рашэнне, хто заняў першае, другое, трэцяе і чацвёртае месцы. Усе гульцы атрымліваюць камандныя (за перамогу ці паразу) і асабістыя (за рыторыку, колькасць і якасць выкладзеных аргументаў) балы. Усяго падчас турніру дэбатары паўдзельнічалі ў пяці адборачных раўндах, а самыя лепшыя – у паўфінале і фінале.

А цяпер пра пераможцаў турніру. Тытул найлепшага спікера падзялілі два таленавітыя дэбатары – *Аляксей Нагавіцын* (студэнт факультэта сусветнай палітыкі МДУ імя М. В. Ламаносава) і *Ілья Андросаў* (выпускнік МДТУ імя М. Э. Баўмана). А камандай-пераможцай стала *Minty chicken* у складзе Юліі Гульцяевай (Расійскі эканамічны ўніверсітэт імя Г. В. Пляханава) і Сяргея Базыліка (Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут). Найлепшым суддзёй прызнана Ксенія Цыганок, выпускніца Інстытута журналістыкі БДУ.

Але перамога – гэта не самае важнае, што можна атрымаць на турніры. Дэбаты – гэта выдатная магчымасць абмеркаваць тэмы, якія цябе хваluюць, але якія дзіўна або складана абмяркоўваць дома на кухні («Гэтая палата адменіць любыя абмежаванні на публічную галізну», напрыклад), або тэмы, якія трывожаць сусветную супольнасць і па якіх карысна сфарміраваць меркаванне любому цывілізаванаму чалавеку («Гэтая палата забароніць адмаўленне халакосту», або «Гэтая палата будзе вучыць дзяцей у школах падвяргаць сумневу любыя аўтарытэты»). Ці часта вы задумваецеся пра тое, чаму нельга (або можна?) адмаўляць факт спробы знішчэння цэлага народа ці навошта патрэбныя аўтарытэты? Дэбаты – гэта шанец навучыцца думаць крытычна і выказваць свой пункт гледжання выразна, структуравана і ўпэўнена. Гэта шанец навучыцца слухаць сураззмоўцу і спрачацца з ім цывілізавана. І набіцьдзе такіх навыкаў (а яшчэ новых сяброў і знаёмых па ўсёй СНД, куды ж без гэтага) для ўдзельнікаў турніру нашмат важнейшае за перамогу ці паразу.

Арганізатар мерапрыемства – клуб дэбатаў гістарычнага факультэта БДУ.

**Арцём ГУЦУЛЮК**

НАВУКА

# Унікальная тэхналогія нашых біяфізікаў

**Стваловыя клеткі сёння ва ўсіх на слыху.** Яны дзеюць цуды, імі спрабуюць лячыць самыя розныя захворванні. Што ж насамрэч уяўляюць сабой гэтыя цудаклеткі?

Напачатку XX стагоддзя навукоўцам было вядома, што спелыя крывяныя клеткі няздольныя да размнажэння. Эрытрацыты – самыя шматлікія з іх – губляюць ядро разам з усім храмасомным апаратам. Як пішуць у спецыялізаваных трактатах, адмова ад вытворчасці сабе падобных характэрная для большасці клетак у нашым арганізме – цягліцавых, залозістых, нервовых. Але калі нейроны ці, скажам, яйцаклеткі могуць жыць дзесяцігоддзямі, то чырвоныя крывяныя цельцы – каля ста дзён. Аднак менш іх пры гэтым не становіцца.

Адзначым, ёсць група захворванняў, для якіх ужо сёння перасадка стваловых клетак (сваіх ці донарскіх) не толькі стандартны, але асноўны ці нават адзіны дзейсны метад лячэння. Такім чынам, напрыклад, прадухіляюцца наступствы вельмі жорсткіх формаў супрацьпухліннай хіміятэрапіі, якая знішчае разам з ракавымі клеткамі ўсю крыватворную тканку. Пасля такога курса хвораму падсаджваюць донарскі касцяны мозг, і чужыя стваловыя клеткі замяняюць загінулыя ўласныя.

Навукоўцы фізічнага факультэта БДУ на чале з загадчыкам кафедры біяфізікі акадэмікам Сяргеем Чаранкевічам разам з фізіёлагамі НАН Беларусі распрацавалі тэхналогію, якая паскарае працэс ператварэння стваловых клетак у нейроны.



*Кандыдат фізіка-матэматычных навук Павел БУЛАЙ у лабараторыі клеткавай інжынерыі і нанабіятэхналогіі БДУ. Лабараторны ўзор прылады змясціўся на інкубатары. Новая тэхналогія, якая паскарае працэс ператварэння стваловых клетак у нейроны, – толькі частка цэлага комплексу прац і даследаванняў, што праводзяцца ў нашай краіне.*

Лабараторны ўзор прылады, якая выкарыстоўваецца для стымуляцыі клетак, распрацавалі і вырабілі навуковыя супрацоўнікі лабараторыі клеткавай інжынерыі і нанабіятэхналогій кафедры біяфізікі фізфака БДУ.

Аналагаў дадзенаму апарату і тэхналогіі ў нашай краіне не існуе. Эксперыментальная прылада біяфізікаў БДУ носіць прыкладны характар. Арыентавана яна на ўжыванне ў медыцынскай сферы. Гаворка ідзе пра клеткавыя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў медыцыне для клеткавай тэрапіі. Як вядома, з узростам чалавека колькасць стваловых клетак становіцца ўсё меншай, адпаведна, аднаўленчыя магчымасці арганізма таксама зніжаюцца. Нашы біяфізікі пры даследаванні чарговага фізічнага фактару высветлілі: на працэс вырошчвання стваловых клетак уплывае стымуляцыя пераменным электрычным полем з вызначанымі параметрамі і амплітудай. Акрамя таго, скарачаецца час навучання стваловых клетак, а гэты працэс дазваляе эканоміць дарагія роставыя фактары, якія ўплываюць на развіццё стваловых клетак у нейронападобным кірунку.

Створаная прылада – толькі частка цэлага комплексу прац і даследаванняў, якія праводзяцца ў нашай краіне фізікамі, хімікамі, нейрахірургамі, генетыкамі і іншымі спецыялістамі, навуковыя працы і распрацоўкі якіх накіраваныя на вывучэнне клетак і аднаўленне функцый нервовай сістэмы чалавека.

Адзначым, даследчыя заданні выконваліся ў рамках Дзяржаўнай праграмы «Інавацыйныя біятэхналогіі», дзеянне якой разлічана да 2015 года.

**ДАВЕДКА**

У 1900-х гадах вядомы гістолаг прафесар Ваенна-медыцынскай акадэміі Санкт-Пецярбурга Аляксандр Максімаў даследаваў развіццё клетак крыві і стварыў даволі стройную тэорыю. Паводле яе ў чырвоным касцяным мозгу жывуць адмысловыя клеткі, адзіны занятак якіх – дзяліцца. Пасля кожнага дзялення, як і трэба, атрымліваюцца дзве аднолькавыя маладыя клеткі. Але ў адной з іх пачынаюцца марфалагічныя змены, у выніку якіх яна ператвараецца ў адну з клетак крыві. Іншая ж, падросшы да патрэбнага памеру, ізноў дзеліцца – і вось адна з дзвюх яе «дачок» выбірае кар'еру крывяной клеткі, а другая займае месца «маці». Можна ўявіць, што клеткі, якія дзеляцца, як бы ўтвараюць ствол, ад якога ў кожным цыкле адыходзяць галінкі – клеткі, якія набываюць спецыялізацыю. Мабыць, таму Максімаў, выкладаючы ў 1909 годзе сваё адкрыццё на пасяджэнні гематалагічнага грамадства ў Лейпцыгу, назваў клеткупрамаці ўсіх клетак крыві Stamzelle, гэта значыць стваловай.

**Жанна ВАСАНСКАЯ**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## 20 гадоў Канстытуцыі Беларусі

**Міжнародная канферэнцыя «Канстытуцыя – асноўны закон беларускай дзяржавы і грамадства» прайшла 11–12 сакавіка ў БДУ. Яна была прысвечана 20-годдзю прыняцця Канстытуцыі нашай краіны.**

У адкрыцці ўзялі ўдзел міністр юстыцыі Беларусі Алег Сліжэўскі, першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў, загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ Рыгор Васілевіч, загадчык кафедры канстытуцыйнага і муніцыпальнага права юрыдычнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава Сурэн Авак'ян, заслужаны дзеяч навукі Расійская Федэрацыі Юрый Ціхаміраў і інш.

Удзельнікамі канферэнцыі сталі звыш 150 навуковых і вядучых юрыстаў з Беларусі, Расіі, Арменіі і Латвіі. Цягам двух дзён абмяркоўваліся вынікі канстытуцыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь за 20 гадоў, прааналізаваны сучасныя праблемы дзяржаўнага заканадаўства, разгледжаны новыя шляхі аптымізацыі прававога рэгулявання ў мэтах умацавання канстытуцыйных асноў Беларусі і краін СНД.

Арганізатары канферэнцыі – юрыдычны факультэт БДУ, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі, Міністэрства юстыцыі нашай краіны, аб'яднанне «Беларускае грамадства «Веды» і Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў.

## Дыялог замест канфлікту

**Канферэнцыя «Міжнародная журналістыка 2014 года: дыялог культур і ўзаемадзеянне медыя розных краін» адбылася ў Інстытуце журналістыкі БДУ.**

Як адзначылі замежныя ўдзельнікі канферэнцыі, у кантэксце апошніх трагічных падзей на кіеўскім Майдане гэтая сустрэча ў Мінску стала важнай пляцоўкай для дыскусіі па надзённых пытаннях палітычнага і эканамічнага развіцця на постсавецкай прасторы. Дыялог культур і ўзаемадзеянне СМІ – менавіта тое, чаго не хапае сёння ў свеце для вырашэння вялікіх і малых канфліктаў.

На канферэнцыі навукоўцы і практыкі розных краін абмеркавалі актуальныя напрамкі па тэматыцы форуму. Гэта асвятленне інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы, медыйнае забеспячэнне кітайска-беларускага і беларуска-венесуэльскага супрацоўніцтва, сучасная культура ў люстэрку прэсы, перспектыўныя напрамкі вэб-журналістыкі, самарэгуляванне СМІ, журналісцкая адукацыя і іншыя. Канферэнцыя была арганізавана кафедрай замежнай журналістыкі і літаратуры пры ўдзеле газеты «Рэспубліка» і грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз журналістаў».

## У гонар С. Я. Янчанкі

**17 лютага на эканамічным факультэце адбыўся круглы стол «Палітычная эканомія – навука каралёў».**

Ён быў прысвечаны навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці ініцыятара ўзнаўлення вышэйшай палітэканамічнай адукацыі ў БДУ, арганізатара аддзялення палітычнай эканоміі БДУ, заслужанага работніка вышэйшай школы БССР, загадчыка кафедры палітычнай эканоміі БДУ (1965–1969 і 1978–1989), доктара эканамічных навук, прафесара Сцяпана ЯНЧАНКІ з нагоды 90-годдзя з дня яго нараджэння.

На круглым стале прысутнічалі супрацоўнікі кафедры тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, выпускнікі аддзялення палітычнай эканоміі розных гадоў, у тым ліку прафесары і дацэнты Акадэміі МУС і іншых ВНУ, прадстаўнікі навуковых устаноў і беларускага прадпрымальніцтва.

Удзельнікі адзначылі вялікі ўплыў Сцяпана Яфімавіча на станаўленне палітэканамічнага прафесіяналізму кожнага з выступоўцаў, агромністае значэнне яго навуковай і педагагічнай спадчыны для далейшага развіцця палітычна-эканамічнай думкі новым пакаленнем даследчыкаў не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім славянскім свеце.

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: эканамічнай геаграфіі замежных краін, банкаўскай эканомікі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: аналітычнай хіміі, матэматычнага мадэлявання і аналізу даных;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: геаграфічнай экалогіі, геадэзіі і картаграфіі, глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм, эканамічный геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, неарганічнай хіміі, электрахіміі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, клетачнай біялогіі і біяінжынеры раслін, заалогіі, генетыкі, малекулярнай біялогіі, тэхналогій камунікацыі, карпаратыўных фінансаў, матэматычнага мадэлявання і аналізу даных, вышэйшай матэматыкі, вылічальнай матэматыкі, інфармацыйных сістэм кіравання, матэматычнай фізікі, матэматычнага мадэлявання і кіравання, метадаў аптымальнага кіравання;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: дынамічнай геалогіі, глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм, эканамічнай геаграфіі замежных краін, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, біяхіміі, карпаратыўных фінансаў, інфармацыйных сістэм кіравання, шматпрацэсарных сістэм і сетак;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, карпаратыўных фінансаў;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, тэхналогій праграмавання.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ рэабілітaлогіі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.*

**ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ЗАГАДЧЫКА АДДЗЕЛА аэракасмічных даследаванняў па спецыяльнасці 01.04.01 (прыборы і метады эксперыментальнай фізікі);

ЗАГАДЧЫКА ЛАБАРАТОРЫІ дыстанцыйнай фотаметрыі па спецыяльнасці 01.04.01 (прыборы і метады эксперыментальнай фізікі);

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі дыстанцыйнай фотаметрыі па спецыяльнасці 01.04.01 (прыборы і метады эксперыментальнай фізікі).

*Тэрмін конкурсу – 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220045, г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл.: 212-48-43.*

**РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ філасофіі і метадалогіі ўніверсітэцкай адукацыі;

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ філасофіі і метадалогіі ўніверсітэцкай адукацыі;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ філасофіі і метадалогіі ўніверсітэцкай адукацыі;

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ інфармацыйных тэхналогій у адукацыі;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ інфармацыйных тэхналогій у адукацыі;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ аховы працы і заканадаўства аб працы.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, пакой 120, тэл. 200-91-07.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Рэктару БДУ прысвоена званне ганаровага прафесара в'етнамскага ўніверсітэта Бінь Зыонг** – БелТА, rambler.ru, rss.novostimira.com, collegemvd.by (11.03).

**Пра Беларускую студэнцкую юрыдычную алімпіяду, якая прайшла 28 лютага ў БДУ** – 1 нацыянальны канал Беларускага радыё, радыё «Сталіца», АНТ (28.02).

**У БДУ створана тэхналогія паскарэння росту стваловых клетак** – megacat.by (03.03), БелаПАН, БелТА, АНТ (04.03), «Рэспубліка», respublika.info (06.03), 24 Dok (10.03).

**Другі адкрыты чэмпіянат па настольным хакеі прайшоў у БДУ** – minsknews.by, megacat.by (27.02), БТ- 1 (01.03).

**Пра міжнародны адкрыты студэнцкі турнір па парламенцкіх дэбатах «МОСТ БДУ–2014»** – open.by (26.02), mngz.ru (03.03).

**Форум моладзевай навукі БДУ** – 1 нацыянальны канал Беларускага радыё, радыё «Сталіца» (20.02), megacat.by (23.02), БелТА, kv.by (24.02 ).

**Інтэрв'ю дацэнта кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта БДУ Віталя Матуліса** – «Рэспубліка», respublika.info (22.02).

**Пра акцыю БДУ «Мы – нашчадкі Перамогі», прымеркаваную да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў** – БТ-1, megacat.by (24.02 ), «Рэспубліка», respublika.info ( 22.02 ), «Звязда», zviazda. by (25.02).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ДАСЯГНЕННІ

# Рухавік росту эканамфака

**Залаты і два сярэбраныя медалі заваявалі студэнты эканамічнага факультэта БДУ на II міжнародным чэмпіянаце студэнтаў па карпаратыўных фінансах Growth Driver. Фінал праходзіў 1 і 2 сакавіка ў МДУ імя М. В. Ламаносава.**




*Вольга Кучук, Алена Хамякова і Анастасія Пракаповіч*

Уладальнікам залатога медаля стала чацвёртакурсніца Алена Хамякова, а сярэбраных – яе аднагрупніцы Вольга Кучук і Анастасія Пракаповіч. Дзяўчаты вырашалі тэставыя заданні па эканамічных дысцыплінах і асновах карпаратыўных фінансаў. Пасля індывідуальнага спаборніцтва студэнткі абаранялі камандны праект. Ім было прапанавана заданне па разліку трох варыянтаў эканамічнай эфектыўнасці інвеставання ў перапрацоўчы завод. Маладым аналітыкам трэба было абгрунтаваць сваё рашэнне і даказаць правільнасць яго рэалізацыі. Вынікі каманднага выступу будуць вядомыя толькі ў канцы сакавіка.

Усяго ў фінальным паядынку ўдзельнічала 25 каманд з Беларусі, Расіі, Украіны і Латвіі. Яны прайшлі папярэдні адбор з сотні студэнцкіх каманд, сярод якіх было 7 беларускіх. Але ў вырашальным туры нашу краіну прадставілі толькі студэнткі эканамічнага факультэта БДУ. Іх падрыхтоўкай займаўся старшы выкладчык кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі эканамічнага факультэта БДУ Аляксандр Шашко.

Сваімі ўражаннямі з карэспандэнтам нашай газеты падзялілася пераможца спаборніцтваў *Алена Хамякова.*

– Для нас было поспехам ужо прабіцца ў фінал у Маскве. У адборачным анлайн-туры прынялі ўдзел 107 каманд з Расіі, Украіны, Казахстана, Латвіі і Беларусі. Асабліва прыемна, што менавіта каманда эканамічнага факультэта БДУ мела гонар прадставіць нашу краіну на такіх прэстыжных спаборніцтвах.

Мы пастараліся годна паказаць наш універсітэт на міжнароднай пляцоўцы ведаў і ў нас гэта атрымалася. Чэмпіянат быў арганізаваны на высокім узроўні. Гэта тычыцца і арганізацыі пражывання (у інтэрнаце МДУ), і харчавання замежных каманд-удзельнікаў, і, вядома ж, уласна самога правядзення чэмпіянату, які праходзіў на базе эканамічнага факультэта МДУ.

Фінальны раўнд складаўся з каманднай часткі і індывідуальнай. Спачатку ўсім камандам было прапанавана абраць найбольш эфектыўны варыянт інвеставання для нафтаперапрацоўчага завода, затым, ужо ў Маскве, праходзіла абарона прэзентацый рашэнняў кожнай з каманд перад журы. У індывідуальным туры прапанаваліся 15 тэставых заданняў і яшчэ адзін кейс, дзе неабходна было разлічыць аптымальны варыянт фінансавання іпатэчнай кампаніі пры розных сцэнарыях развіцця эканомікі. Заданні былі максімальна набліжаны да рэальнага жыцця, таму тым каштоўней было прапанаваць і абгрунтаваць найлепшае рашэнне.

Асобнае дзякуй выдатнаму выкладчыку Шашко Аляксандру Аляксандравічу, які не толькі суправаджаў нас у паездцы на чэмпіянат, але і аказваў дапамогу ў падрыхтоўцы, падтрымліваў наш камандны дух, вераў, што мы годна прадставім наш факультэт і ўніверсітэт. Цікава, што ў навучальным плане нашай спецыяльнасці «Фінансы і крэдыт» нават няма прадмета «Карпаратыўныя фінансы», тым не менш, дзякуючы высокаму ўзроўню лекцый некаторых выкладчыкаў, уключаючы А. А. Шашко, нам удалося атрымаць веды, якія спатрэбіліся на чэмпіянаце.

**Гутарыў**
**Арцём ГУЦУЛЮК**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Супермен здольны на многае!

**Феерверк яркіх эмоцый, гучная музыка, сямёра абаяльных хлопцаў у шыкоўных гарнітурах, палымяныя песні і вялізнае жаданне танчыць – няпоўны спіс таго, чым запомніўся 26 лютага ў клуберэстаране Fashion club, дзе прайшоў шоу-конкурс «Супермен–2014» Студгарадка БДУ.**



*Аляксей Кухальскі са сваім пухнатым талісманам і іншымі ўдзельнікамі на «Дэфіле ў вобразе»*

На працягу дзвюх гадзін наймацнейшыя, самыя абаяльныя хлопцы інтэрнатаў стваралі непаўторную атмасферу, дэманструючы свой інтэлект і чароўнасць.

Свайго апагею шоу дасягнула падчас конкурсу талентаў. Ніякіх штампаў, плагіяту і «заезджанасці». Кожны нумар быў унікальным і надзвычай прыгожым. Падчас яркіх выступленняў удзельнікаў гледачы і журы змаглі акунуцца ў далікатнарамантычную атмасферу Парыжа, убачыць месяцовую хаду і цудоўныя танцавальныя дуэты, якія дэманстравалі неверагодна прыгожыя і складаныя падтрымкі. Але пасля гэтага гледачоў чакала яшчэ адна прыемная неспадзеўка – сустрэча з капітанам Джэкам Вераб'ём, Гаем Фоксам, «копам», скандынаўскім богам Торам, Кананам-варварам, зоркай рок-н-ролу Ангусам Янгам і кантралёрам «Мінсктранса». Гэта стала магчымым дзякуючы заключнаму конкурсу «Дэфіле ў вобразе», пасля якога абыякавых да вынікаў конкурсу ў зале сапраўды не засталося.

Нягледзячы на ўсю кампетэнтнасць, журы аднагачна зведала цяжкасці пры падсумаванні. Бо пасля таго як стала відавочнай загадка, ... 

Нягледзячы на ўсю кампетэнтнасць, журы аднагачна зведала цяжкасці пры падсумаванні. Бо пасля такога струменя прыгажосці, мужнасці і творчасці вылучыць найлепшага з лепшых – задача нялёгкая. Тым не менш **«Суперменам–2014» стаў Аляксей Кухальскі** з інтэрната № 7. Другое месца і *тытул «Містэр крэатыў» заваяваў Ілья Горынаў,* інтэрнат № 6, а трэцяе месца і званне *«Містэр элегантнасць» атрымаў Алег Малахаў,* інтэрнату № 2.

Зараз шумныя суседзі і цяжкія торбы не праблема, бо ў нас з'явіўся свой Супермен, гатовы прыйсці на дапамогу любому! Па словах Аляксея Кухальскага, самым складаным для яго стаў творчы нумар: «Бо я курсант ваеннага факультэта, мне было складана перабудавацца са строгай страявой падрыхтоўкі на пластычны танцавальны нумар, таму спадзяваўся яшчэ і на акцёрскае майстэрства». Зараз Аляксей зразумеў, што здольны на многае!

У гэты вечар усе гледачы ўбачылі ўзрушальнае шоу і атрымалі магутны зарад пазітыву, а ўсе ўдзельнікі, вядома ж, памятныя прызы. Адважымся выказаць здагадку, што гэты дзень усім запомніцца надоўга і яго паўтору будуць чакаць з нецярпеннем.

**Надзея КРАЎЧУК**
**Наталля МАЖУЛЬ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Сцэнарый журфакаўцаў БДУ паспяховы ў Расіі

**Студэнты Інстытута журналістыкі БДУ сталі фіналістамі прэстыжнага расійскага конкурсу сцэнарыяў «Галоўпітчынг» кінакампаніі «Галоўкіно» (Масква).**



*Дзяніс Мароз і Дзяніс Кабцоў*

Конкурсная работа Дзяніса Мароза і Дзяніса Кабцова «Клуб самагубцаў» увайшла ў 35 лепшых на думку знакамітага журы, у склад якога ўвайшлі Фёдар Бандарчук, Міхаіл Галусцян, Валерый Тадароўскі, Канстанцін Эрнст і іншыя прадстаўнікі расійскага шоу-бізнесу і кінематографа. Пра тое, як невялікая творчая ідэя прынесла вялікі поспех, нам расказаў пяцікурснік БДУ Дзяніс Мароз.

***– Як вы даведаліся пра конкурс?***

– Зусім выпадкова, праз банер на партале kinopoisk.ru, і адразу загарэлія ідэяй паўдзельнічаць. Нас прыцягнула тое, што для гэтага не патрабавалася ніякага вопыту і спецыяльнай адукацыі – была важная толькі цікавая, крэатыўная ідэя. І менавіта яна ў нас якраз і з'явілася.

***– Гэта для вас быў першы прафесійны конкурс?***

– Так, гэта быў наш дэбют. Мы ні на што не разлічвалі, а праз час нават забыліся пра заяўку. І былі вельмі здзіўлены, калі даведаліся, што наша праца выйшла ў фінал з 2900 сцэнарыяў.

Для нас удзел у такім конкурсе – гэта зусім іншы ўзровень. У Расіі развітая індустрыя, ёсць фінансаванне, а апроч гэтага ў склад журы ўвайшлі сапраўдныя мэтры кіно.

***– Ідэя сцэнарыя нарадзілася даўно?***

– Прыдумляць сцэнарый мы пачалі толькі пасля таго, як даведаліся пра конкурс і вырашылі ўдзельнічаць. Вядома, у нас не было адпаведнай адукацыі, але ў гэтым плане нам вельмі дапамаглі веды, якія мы атрымалі на спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» Інстытута журналістыкі БДУ. У нас было шмат творчых прадметаў, якія дапамагалі раскрыць наш крэатыўны патэнцыял. Таксама невялікі вопыт напісання сцэнарыяў для відэаролікаў мы атрымалі, праходзячы навучальныя практыкі ў рэкламных агенцтвах.

***– Дзеля чаго вы рашыліся ўдзельнічаць у конкурсе?***

– Для пачатку – дзеля забавы. Мы зусім не імкнуліся да перамогі. Але было цікава паспрабаваць свае сілы і атрымаць ацэнку ад людзей, якія сапраўды з'яўляюцца прафесіяналамі ў гэтай справе.

***– Што вам дала перамога і вопыт удзелу ў такім спаборніцтве?***

– Мы зразумелі, што трэба не баяцца і спрабаваць. Сталі яшчэ больш верыць у свае творчыя сілы *(смяецца).* Зразумела, мы хочам, каб наш праект атрымаў працяг. Плануем дапрацаваць сцэнарый, можа, трохі змяніць яго, а затым звязацца з кінакампаніямі. Добра, што маем усе неабходныя для гэтага рэкамендацыі.

***– Вы заканчваеце ўніверсітэт, якія ў вас планы?***

– Дзякуючы конкурсу ў нас з суаўтарам узнікла ідэя заснаваць крэатыўнае агенцтва. Над канцэпцыяй мы яшчэ думаем, але магу расскрыць назву нашай кампаніі – «КаМоД».

Сакрэты сцэнарыя паспяховай кінастужкі «Клуб самагубцаў» аўтары пакуль не раскрываюць. Вядома, што карціна ўяўляе сабой гарадскі трылер, у якім напружаны сюжэт спалучаецца з маральнай дылемай герояў. Работа Дзяніса Мароза і Дзяніса Кабцова атрымала высокую ацэнку экспертнага журы і была рэкамендавана да экранізацыі.

Жадаем хлопцам творчых поспехаў і перамог!

**Гутарыла**
**Ксенія КАРАВАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

14 сакавіка 2014 года
Падпісана да друку 12.03.2014 г.
Зак. ___. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***